

ЭтнаТрадыцыя

# КАЛЯДНЫ СПЕЎНІК

ЭтнаТрадыцыя

# КАЛЯДНЫ СПЕЎНІК

Мінск
«Медиал»
2020

УДК 784.4
ББК 85.94я438
К 17

Укладанне
Сяржук Доўгушаў
Расшыфроўка нот:
Аляксандр Ясінскі
Набор нотнага матэрыялу:
Ганна Канстанцінава
Падрыхтоўка і набор тэкстаў:
Сяржук Доўгушаў
Уступны тэкст:
Яніна Грыневіч

*Спеўнік выдадзены дзякуючы дапамозе Прадстаўніцтва Еўрапейскага звязу ў Беларусі*

К 17 **Калядны спеўнік** / уклад. С.Доўгушаў. — Мінск : «Медиал», 2020 — 48 с. : іл.
ISBN 978-985-7229-39-0

У спеўніку прадстаўлены адметныя ўзоры фальклору зімовага цыкла – калядных песень, што выконваюцца на працягу ўсяго святочнага перыяду з 24 снежня па 6 студзеня (з 6 па 19 студзеня). Песні з розных рэгіёнаў Беларусі пададзены з нотамі і прыдатныя для супольнага выканання. Яны яднаюць, ствараюць асаблівы радасны настрой, выказваюць пажаданні лепшай долі, шчасця і дабрабыту ў будучым годзе.

Адрасуецца ўсім, хто цікавіцца беларускім фальклорам і традыцыйнай культурай.

УДК 784.4
ББК 85.94я438

ISBN 978-985-7229-39-0

© «ЭтнаТрадыцыя», 2020
© Афармленне. «Медиал», 2020
© Доўгушаў, 2020

# Ай, калядачкі, нашы нежачкі

*Калядная*




Ай, калядачкі, нашы нежачкі,
Ой, рана-рана, нашы нежачкі.

Ай, завеелі ў карчму сцежачкі,
Ой, рана-рана, у карчму сцежачкі.

Ай, калядачкі, прыбліжыцеся,
Ой, рана-рана, прыбліжыцеся.

Ай, калбасачкі, паніжыцеся,
Ой, рана-рана, паніжыцеся.

Нам піліпаўка надакучала,
Ой рана-рана, надакучала.

Нас піліпаўка пазамучала,
Ой, рана-рана, пазамучала.

А ўсё сена ды павывалакла,
Ой, рана-рана, ды павывалакла.

З клеці жыта ўсё павысапала,
Ой, рана-рана, ды павысапала.

# Прыйшла Каляда ўвечары

*Калядная*




Прыйшла Каляда ўвечары,
Прынясла пірагі ў рэшаці.
Паставіла пірагі на стаўпе,
Сама села Каляда ў куце.
А малыя дзеці за пірог:
«Пайшла, Каляда, за парог!»



# Добры вечар табе, пане гаспадару

*Калядная гаспадару*




Добры вечар табе, пане гаспадару,
Радуйся, ой, радуйся, земля, сын Божы нарадзіўся!*
Засцілайце столы, усе, колькі маем,
Дай кладзеце калачы святое пшаніцы.
Дай прыйшлі к нам жэ тры святы ў госці.
Дай першае свята – Хрыстова раджэнне.
А другое свята – святога Васілля.
А трэцяе свята – святое Храшчэнне.

* *Прыпеў «Радуйся, ой, радуйся, земля, сын Божы нарадзіўся!» паўтараецца пасля кожнага радка.*

# А ў бару, ў бару

*Шчадроўка*




А ў бару, ў бару сьвеча гарэла,
Сьвяты вечар!*
Сьвеча гарэла, іскарка ўпала,
Іскарка ўпала, возера стала.
А ў том возяры сам Бог купаўся
З Ісусам Хрыстом, сьвятым Раждзяством.

*Прыпеў «Сьвяты вечар!» паўтараецца пасля кожнага радка.*





**Прыгавор пасля песні:**

«Шчадрую, шчадрую,
Каўбасу чую.
Дайце каўбасу,
Дамоў панясу.
Дайця другую,
Шчэ пашчадрую.
Дайця трэццяю,
Хоць авечаю!
Скарэя дарыця
Да нас не барыця:
Кароткія світкі,
Памерзлі лыткі».

# Святы Мікалай

*Шчадроўка*




Святы Мікалай сеў ў канец стала,
Шчодры вечар!*
Галоўку скланіў, слёзанькі разліў,
А з тае слязы стаў ціхі Дунай,
А ў тым Дунаю Гасподзь купаўся,
Гасподзь купаўся і святы Пятро,
Ой, купаліся й рахаваліся,
А гасподзь кажа: «Неба вышэйша!»
А Пятро кажа, што мора глыбей!
Богава праўда пайшла небамі,
Пятрова праўда пайшла рэкамі.

* *Прыпеў «Шчодры вечар!» паўтараецца пасля кожнага радка.*



# По конец стола седзіць Мікола

*Шчадроўка*




По конец стола седзіць Мікола,
Шчодры вечор!*
Голоўку склоніў, сьлёзоньку проліў.
Сьлёзанька ўпала, рэчанька стала.
Ў той рэчоньцы купаўся Петро,
Купаўся Петро, сьветы Роджэство.

* *Прыпеў «Шчодры вечор!» паўтараецца пасля кожнага радка.*

# Нова радасьць стала

*Калядны псальм*









Нова радасьць стала, што шчэ ня бывала.
Над Батлеей зьвязда ясна сьвету зазьзяла.

Пастушкі з ягняткам перад тым дзіцяткам
Упадаюць на калені для яго ўслаўленьня.

Дзе Хрыстос радзіўся, з Панны ўцелавіўся,
Як чалавек, пялёнкамі бедна спавіўся.

І мы ўраз сьпяваем, Хрыста праслаўляем,
Нараджанага з Марыі пакорна ўпрашаем.

Просім цябе, Божа, просім мы, як можам:
«Дай нам у небе жыцьцё шчасна, на зямлі прыгожа».

# Неба і Зямля

*Калядны псальм*








Неба і Зямля, Неба і Зямля
Радасна сьпяваюць.
Ангелы сьвету, ангелы сьвету
Дзіва абвяшчаюць.

**Прыпеў:**
Хрыстос нарадзіўся, Бог аб’явіўся
Ангелы сьпяваюць, пастушкі іграюць,
Дзіва, дзіва абвяшчаюць.

У Батлееме, у Батлееме
Вясёла навіна:
Чыстая Дзева, Чыстая Дзева
Нарадзіла сына.

І мы Дзіцятку, і мы Дзіцятку
Богу паклон даймо.
Слава на Ўзвышніх, слава на Ўзвышніх
Яму засьпявайма.





# А ўчора зь вячора

*Калядны псальм*




А ўчора зь вячора (2) з нябеснага двора,
З нябеснага двора (2) прыйшла к нам навіна:
Прыйшла к нам навіна (2) – нарадзіўся нам Сына.
Нарадзіўся нам Сына (2) ад дзевы Марыі!

**Другі варыянт тэксту:**

Учора зь вячора, засьвяціла зора *
Зора засьвяціла, сьвет узьвесяліла.
Сьвет узьвесяліўся, Хрыстос нарадзіўся.
Хрыстова раджэньне – людзям на збаўленьне.
Людзі, прыбягайце, Хрыста прывітайце.
Здаровы бывайце, нам Каляду дайце.
Здаровы сьвяткуйце, дайце не шкадуйце!



** Кожны радок паўтараецца двойчы.*



# Добры вечар, шчодры вечар

*Шчадроўка*




Добры вечар, шчодры вечар
Усім людзям на ўвесь вечар!

– А ці дома пані твая?
А я бачу, яна дома.

– Яна дома не гуляе,
Піражочкі рашчыняе!

– А ці дома пан гаспадар?
А я бачу, што ён дома.

Што ён дома не гуляе,
Чалядоньку даглядае!

На ём шуба шубалёва,
Прычаплёна каліточка.

А ў калітцы ў той новай
Усім госцям па златому.

Добры вечар, шчодры вечар
Усім людзям на ўвесь вечар!

# Добры вечар тому

*Калядная*




Добры вечар тому,*
Хто ў гэтаму дому.
Мы самі з сабою,
З дзецьмі і жаною.
Сталы засцілаем,
Каляды спраўляем.

А па гэтай модзе
Будзьмо ўсе здаровы.
А па гэтай казцы
Жывіце ў ласцы.

* *Кожны радок паўтараецца двойчы.*



# Ходзіло-блудзіло сэмсот малойцэв

*Шчадроўка гаспадару*




Ходзіло-блудзіло сэмсот малойцэв,
Шчодры вэчор!*
Сэмсот малойцэв, сэм коляднічків.
Прыблудзілыса к новому двору,
К новому двору, к пану Рыгору.
– Ой добры вэчор, пане Рыгорэ,
Мі ж твого двора нэ мінаемо,
Мі ж усі тэбэ вэлічаемо.

* *Прыпеў «Шчодры вэчор!» паўтараецца пасля кожнага радка.*

# Шчодры вэчор

*Шчадроўка*




(й) А ў полю, ў полю свіцёлка стаіць.
Шчодры вэчор, добры вэчор!*
А ў той свіцёлцэ тры окэнэчкы:
Ў пэршым окэнцы ясны місяцік,
Ў другім окэнцы яснэ сонэчко,
Ў трэцім окэнцы ясны зорэчкы.
Ой, шо місяцік – то й господарык,
А шо сонэчко – то й господынька,
А шо зорочкы – то іх(э) дэткы.

*Прыпеў «Шчодры вэчор, добры вэчор» паўтараецца пасля кожнага радка.*



# Посярод двора крутая гора

*Калядная*




Посярод двора крутая гора.
Святы вачор*
А на тый горэ жылі столяры.
Тые столярэ церков стройілі,
Цэрков стройілі с трэма вокнамі.
Первэ вокэнцэ – то яснэ сонцэ,
Другэ вокэнцэ – яснэ мэсячык,
Трэцце вокэнцэ – яснэ зэрночка.
Яснэ сонейко – то ёго жона,
Ясны месячык – то ёго сынок.

*Прыпеў «Святы вачор» паўтараецца пасля кожнага радка.*

# Ой, што то ў бару

*Калядная*




Ой, што то ў бару шуміць да гудзе?
Сьветы вечар, шуміць да гудзе.*

Шуміць да гудзе, пчольна матка йдзе,
Пчольна матка йдзе, роікі вядзе.
А к каму ідзе? К пану Ёняю.

*Рэфрэн «Сьветы вечар» паўтараецца пасля кожнага радка з другім яго паўвершам.



# Ой, рана-рана куры запелі

*Шчадроўка*




Ой, рана-рана куры запелі,
Святы вечар!*
А шчэ й найраней пан Андрэйка ўстаў.
Пан Андрэйка ўстаў, званком зазваніў,
Званком зазваніў, братоў пабудзіў:
– Ўставайце, браткі, коні сядлайце,
Да й паедзема мы ў чыстае поле,
У чыстае поле на паляванне,
Запалюема дзевяць лісікаў,
Дзевяць лісікаў, дзесяту куньку,
Дзесяту куньку матцы на шубку.

*Прыпеў «Святы вечар!» паўтараецца пасля кожнага радка.

# Ой, рана, рана

*Шчадроўка*




Ой, рана, рана куры папелі, Сьвятэй вечар!*
Ой, раней таго Манечка ўстала,
Манечка ўстала, сьвечы сукала,
Сьвечы сукала, у цэркаўку ішла,
Ў цэркаўку ішла, хлапцоў будзіла:
– Братцы, устывайця, коні сідлайця,
Коні сідлайця, ў дарогу іжжайця,
Ў дарогу іжжайця, у мяне пытайця:
– Ой, чыя дачка каралеўначка?
– Пітракова дачка да й Манютачка.

**Прыпеў «Сьвятэй вечар!» паўтараецца пасля кожнага радка.*



# А ў ляску, ў ляску

*Шчадроўка дзяўчыне*




А ў ляску, ў ляску, на жоўтым пяску,
Сьвяты вечар!*
Пава лiтала, пер’я зьбірала,
Пер’я зьбірала, ў рукавок клала.
З рукаўка брала, вяночак віла,
А зьвіўшы вянок ды пайшла ў танок.
Што ў тым танку трох палюбіла.
Аднаму дала шолкавы платок,
Другому дала залаты пярснёк,
А за трэцяго ды й сама пашла.

**Прыпеў «Сьвяты вечар!» паўтараецца пасля кожнага радка.*

# На луцэ, на луцэ, шоўкавай траве

*Шчадроўка хлопцу*




На луцэ, на луцэ, шоўкавай траве,
Святы вечар добрым людзям!*
Млады Мікітка (Лёнечка) коніка пасе,
Коніка пасе, з канём гавора:
– Ай, конь ты мой конь, я ж цябе прадам,
Я ж цябе прадам за руб, за стрэлку,
За руб, за стрэлку, за красну дзеўку,
Я стрэлку зламлю, я дзеўку вазьму.



**Прыпеў «Святы вечар добрым людзям!» паўтараецца пасля кожнага радка.*



# На вараным канёчку

*Калядная*




На вараным канёчку
Каляда, каляда!*
У пісаным вазочку
Едзе, едзе калёска.
– Куды едзеш, калёска?
– А я еду, паеду
К Лёнечку на двор.
– Дары мяне, Лёнечка,
– А чым жа цябе дарыць?
– Пшанічачкі рашато,
За пшанічкай калбаску,
За калбаскай гарэлку.

**Прыпеў «Каляда, каляда!» паўтараецца пасля кожнага радка. Кожны радок паўтараецца двойчы.*

# Ехала каліда з Полацку

*Калядная*




Ехала каліда з Полацку, з Полацку
На сівенькім конічку, конічку,
На маляваным вазочку, вазочку.
Заехала каліда к Ванічку, к Ванічку.
–Чым будзіш, Ванічка, дарыці, дарыці?
А ці жонкаю, а ці пшонкаю,
Ці маладою Манічкай, Манічкай?



# Го-го-го, каза

*Калядная*




Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра.
Дзе рожкі дзела?
– На соль праела.

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра.
Лезь, каза, на печ,
Пакажы чапец.

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра.
Лезь, каза, на кут,
Пакажы хамут.

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра.
Лезь, каза, на пол,
Пакажы хахол.



Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра.
На печы авёс
Вялікі парос.

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра.
На палу жыта
Пачкамі звіта.

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра.
А ў тым жыце
Перапёлачка.

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра.
Вывела дзеці,
Міла глядзеці.

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра.
Дзе каза ходзіць,
Там жыта родзіць.

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра.
Дзе каза рогам,
Там жыта стогам.

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра.
Дзе каза нагой,
Там жыта капой.

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра.
Дзе каза хвастом,
Там жыта кустом.



# О-го-го, коза жэ, о-го-го, сера

*Калядная*




О-го-го, коза жэ, о-го-го, сера.
Не ходзі, коза, жэ ў чыстэе поле.
О-го-го, коза жэ, о-го-го, сера.
У чыстаму полі жэ там жыто росце.
О-го-го, коза жэ, о-го-го, сера.
Дзе коза рогом(ы), там жыто стогом.
О-го-го, коза жэ, о-го-го, сера.
Дзе коза топ-топ(ы), там жыто сем коп.
О-го-го, коза жэ, о-го-го, сера.

# Ой, ну-ну, коза

*Калядная*

♩ = 92









Ой, ну-ну, коза, ой, ну-ну, сіва,
Расхадзісь, каза, па ўсяму полю,
Па ўсяму полю, па хаджайскаму.
Хазяін сядзіць, на казу глядзіць,
Яго жоначка на журавельку.
– Запалі свечу да йдзі да клечу!
Зазірні ў куток, там стаіць шматок.
Нашам жураўлю не многа трэба:
Сем печ, перапечы, рэшата аўса,
Рэшата аўса, наверх каўбаса,
Бочка пшаніцы, да паляніцы,
Возера вады жураўля паіць.

# А ў заінькі

*Калядная*




А ў заінькі – тры думушкі.
Коліда, Коліда!*

Адна дума – полем бегчы.
Друга дума – лесам бегчы.
Трэцяя дума – морам плыці.

Полем бегчы – стральцы заб’юць.
Лесам бегчы – ваўкі з’ядуць.
Морам плыці – утапіцца.

Гаспадыня, не ляніся,
Каля печы павярніся.
Кішка – з печы, кілбаса – з клеці.
Будзе зайку што пад’есці.

**Прыпеў «Коліда, Коліда!» паўтараецца пасля кожнага радка.*



# Будзь, Вася, здароў

*Шчадроўка хлопцу*




Будзь, Вася, здароў, як рыжык бароў.
Гэй, Каляда, Калядзіца!*
Май торбу грошай, хлеб у раскошы.
Май усяго даволі, а бяды ніколі.
Стары год канчаем, новы пачынаем
З ранняю вясною, з буйнаю травою,
З збожжам каласістым, з зярном ядраністым,
З цёплым летам ды громным пры гэтам,
З сонейкам ясным, з долічкай шчаснай.

** Прыпеў «Гэй, Каляда, Калядзіца!» паўтараецца пасля кожнага радка.*

# Ой, за лесом, лесом

*Калядная*




Ой, за лесом, лесом сонцэ(а) сіяе,
Да молоды Юра коня седлае,
Да молоды Юра коня седлае.

Да прыйшоў до его баценько его.
– Да куда, сыночок, коня седлаеш,
Да куда, рідненькі, коня седлаеш?

– Седлаю, баценько, седлаю, рідненькі,
Дай за лютонькі, дай до дзевонькі,
Дай за лютонькі, дай до дзевонькі.

Да прыйшла до его матэнька его.
– Да куда, сыночок, коня седлаеш,
Да куда, рыдненькі, коня седлаеш?



– Седлаю, матэнько, седлаю, рідненька,
Дай за лютонькі, дай до дзевонькі,
Дай за лютонькі, дай до дзевонькі.

Да прышла до его сетрычка его.
– Да куда, брацітко, коня седлаеш,
Да куда, рідненькі, коня седлаеш?

– Седлаю, сестрэнька, седлаю, рыдненька,
Дай за лютонькі, дай до дзевонькі,
Дай за лютонькі, дай до дзевонькі.

Усе звоны звоняць, усе Богу моляць.
Да міло над ранней сонейко ўсходзіць,
Да міло над ранней сонейко ўсходзіць.



# Ляцела сойка чэраз наша сёлка

*Калядная*




Ляцела сойка чэраз наша сёлка,
Каліда, калядзіца!*
Ухапіла сойка Сяргееву жонку.
Бяжыць Сяргейка, полы закасаўшы,
Полы закасаўшы, шапку зняўшы.
Шапку зняўшы, галоўку задраўшы.
– Сойка, сойка, аддай маю жонку.
Мая жонка – не ткаха, не праха,
Не ткаха, не праха, ў хаці расціраха.

** Прыпеў «Каліда, Калядзіца!» паўтараецца пасля кожнага радка.*



# Ой, стаіць явор

*Калядная*




Ой, стаіць ява(о)р, тонкі, высокі,
Святы вечар, тонкі, высокі!*
Тонкі, высокі, ўверсе кудравой.
На тым кудравом сіў арол седзіць.
Сіў арол седзіць, ўсё ў ваду глядзіць.
У ваду глядзіць, шчуку-рыбу бачыць.
– Ой, шчука-шчука, як ты глыбока(о).
Як ты глыбока, так я высока(о).
Ой з цябе, шчука, смачна вячэра,
А з мяне, орла, м'ягка пасцеля.
Ой з цябе, шчука, чашую здымаюць,
А з мяне, орла, пер'я скубаюць.
Ой з цябе, шчука, смачная юшка,
А з мяне, орла, м'ягка падушка.

**Рэфрэн «Святы вечар» паўтараецца пасля кожнага радка з другім яго паўвершам.*

# Да на Дунаечку

*Шчадроўка*




Да на Дунаечку, да на берэжэчку,
Шчодры вечор!*
Там ластаво(а)чка ды й купалася
Да к светому дзеньку прыбіралася.
Да к светому дзеньку, да к Васіллейку,
А к другому жа к Новаму году.

*Прыпеў «Шчодры вечор!» паўтараецца пасля кожнага радка.



# Ой, няма, няма

*Шчадроўка*




Ой, няма, няма пана-госпада,
Шчодры вячор, пана-госпада.
Шчодры вячор, святы Васіллё!

Ой, няма, няма – у гуменцы сядзіць,
Шчодры вячор, у гуменцы сядзіць.
Шчодры вячор, святы Васіллё!

Ў гуменцы сядзіць, піражкі пячэ,
Шчодры вячор, піражкі пячэ.
Шчодры вячор, святы Васіллё!

– Ой, хадзема ж мы да й паможама,
Шчодры вячор, да й паможама.
Шчодры вячор, святы Васіллё!

Ці не даш жа нам хоць па піражку,
Шчодры вячор, хоць па піражку.
Шчодры вячор, святы Васіллё!

Ой, няма, няма пана-госпада,
Шчодры вячор, пана-госпада.
Шчодры вячор, святы Васіллё!

Ой, няма, няма – ў святлоўцы сядзіць,
Шчодры вячор, ў святлоўцы сядзіць.
Шчодры вячор, святы Васіллё!

Ў святлоўцы сядзіць, чырвонцы лічыць
Шчодры вячор, чырвонцы лічыць.
Шчодры вячор, святы Васіллё!

– Ой, хадзема ж мы да й паможама,
Шчодры вячор, да й паможама.
Шчодры вячор, святы Васіллё!

Ці не даш жа нам хоць па чырвонцу,
Шчодры вячор, хоць па чырвонцу.
Шчодры вячор, святы Васіллё!



# За горою каменою

*Шчадроўка*




За горою каменою
Шчодры вечар, Васілею!*
Стоіць церковь с трох верхамі,
З трох верхамі, с трох вокнамі.
Одзін вершык – ясён месец,
Другі вершык – ясна зорка,
Трэцці вершок – яснэ сонцэ.
Ясен месец – сам господар,
Ясна зорка – яго жонка,
Яснэ сонцэ – сам Господ Бог.

*Прыпеў «Шчодры вечар, Васілею!» паўтараецца пасля кожнага радка.

# Звесткі пра песні

**1. Ай, калядачкі, нашы нежачкі**
в.Бобр, Крупскі раён. Запісана ад Ганны Сырыцынай.

**2. Прыйшла Каляда ўвечары**
в.Ананчыцы, Салігорскі раён.
Запісала Л.Ф. Касцюкавец ад В.Пажыган, Л.Міхнавец, Т.Міхнавец.

**3. Добры вечар табе, пане гаспадару**
в.Морач, Клецкі раён.

**4. А ў бару, ў бару**
в.Перарост, Добрушскі раён. Запісана ад Надзеі Судаковай.
ТМКБ «Гомельскае Палессе і Падняпроўе», т.6, кніга 1.
Мінск, «Вышэйшая школа», 2012

**5. Святы Мікалай**
в.Лядзец, Столінскі раён. Запісана ў 1983 г. ад Я.Р. Майсак, Г.Я. Глуско.
«Вянок беларускіх народных песень», Мінск, «Навука і тэхніка», 1988

**6. По конец стола седзіць Мікола**
в.Вароніна, Жыткавіцкі раён. Запісана ад Марыі Лузай.
ТМКБ «Гомельскае Палессе і Падняпроўе», т.6, кніга 1
Мінск, «Вышэйшая школа», 2012

**7. Нова радасьць стала**
Партытура і тэкст з «Беларускага духоўнага спеўніка».

**8. Неба і Зямля**
Гарманізацыя псальма зроблена М.Шчагловым-Куліковічам.

**9. А ўчора зь вячора**
Партытура і тэкст з «Беларускага духоўнага спеўніка».

**10. Добры вечар, шчодры вечар**
г.Столін, Брэсцкая вобласць. Запісана ад В.П. Мельнік у 1961 г.
«Вянок беларускіх народных песень», Мінск, «Навука і тэхніка», 1988

**11. Добры вечар тому**
в.Шутавічы, Смаргонскі раён.
ТМКБ «Гродзенскае Панямонне»
Мінск, «Вышэйшая школа», 2006



**12. Ходзіло-блудзіло сэмсот малойцэв**
в.Клятная, Пінскі раён.

**13. Шчодры вэчор**
в.Заверша, Драгічынскі раён.
Запісана С.Доўгушавым у 2012 г. ад Надзеі Супрун і Ніны Міневіч.

**14. Посярод двора крутая гора**
в.Дзятлавічы, Лунінецкі раён. З рэпертуару гурта «Вытокі».
Запісана С. Доўгушавым у 2016 г.

**15. Ой, што то ў бару**
в.Залессе, Петрыкаўскі раён. Запісана ад Вольгі Ганусевіч.
ТМКБ «Гомельскае Палессе і Падняпроўе», т.6, кніга 1
Мінск, «Вышэйшая школа», 2012

**16. Ой, рана-рана куры запелі**
в.Моладава, Іванаўскі раён.
Запісаў В.Д. Ліцвінка ў 1982 г. ад М.В. Таўсцялёвай.
«Вянок беларускіх народных песень», Мінск, «Навука і тэхніка», 1988

**17. Ой, рана, рана**
в.Красніца, Чачэрскі раён. Запісана ад Г. Ксяндзовай і Г. Ісачанка.
ТМКБ «Гомельскае Палессе і Падняпроўе», т.6
Мінск, «Вышэйшая школа», 2012

**18. А ў ляску, ў ляску**
в.Акцябр, Буда-Кашалёўскі раён. Запісана ад Г.Грыцовай і Т.Чарняцовай.
ТМКБ «Гомельскае Палессе і Падняпроўе», т.6, кніга 1
Мінск, «Вышэйшая школа», 2012

**19. На луцэ, на луцэ, шоўкавай траве**
в.Стаўбун, Веткаўскі раён.
Запісана ў 1985 г. ад М.Л. Зуевай, А.Л. Фяськовай, М.Д. Таранавай, Л.П. Грамадцовай, Ф.Ф. Халюковай, М.П. Чуяшовай, З.Д. Бураковай.
«Вянок беларускіх народных песень», Мінск, «Навука і тэхніка», 1988

**20. На вараным канёчку**
Полацкі раён. З рэпертуару гурта «Варган».

**21. Ехала Каліда з Полацку**
в.Меліхава, Сенненскі раён.
Запісана ў 1973 г. ад Апанассі Змітраўны Шарэнды

**22. Го-го-го, каза**
Са зборніка М.Равенскага «Харавыя творы», сшытак 2.
Мінск «Тэхналогія», 2017
Нотны запіс зроблены М.Равенскім у 1940-х гадах. Песня занатавана кампазітарам у сшытку фальклорных запісаў 1949 г. за N49.

**23. О-го-го, коза жэ, о-го-го, сера**
в.Тонеж, Лельчыцкі раён, Гомельская вобл.
Запісала З.Мажэйка у 1977 г. ад тонежскага жаночага гурта.

**24. Ой, ну-ну, коза**
в.Лутоўе, Жыткавіцкі раён. Запісаў Ю.Выдронак у 2002 г.

**25. А ў заінькі**
в.Канчаны, Верхнядзвінскі раён.
Э 1986. ФЭ 646225, БГАМ
З Аўдыёатласу «Каляндарна-песенная традыцыя паўночнабеларускага рэгіёну ў экспедыцыйна-палявых запісах Т.С. Якіменкі».

**26. Будзь, Вася, здароў**
в.Седча, Пухавіцкі раён. Запісана Т. Варфаламеевай ад Клаўдзіі Несцяронак.
ТМКБ «Цэнтральная Беларусь», т.5, кніга 1. Мінск,
«Вышэйшая школа», 2010

**27. Ой, за лесом, лесом**
в.Вялікая Гаць, Івацэвіцкі раён.

**28. Ляцела сойка чэраз наша сёлка**
в.Ржаўка, Бешанковіцкі раён. Запісана ад Лідзіі Іванаўны Кухто ў 1973 г.

**29. Ой, стаіць явор**
в.Гарадзяцічы, Любанскі раён. Запісана ад Раіны Слівец, Вольгі Цішка.

**30. Да на Дунаечку**
в.Вароніна, Жыткавіцкі раён. Запісана ад Марыі Лузай.
ТМКБ «Гомельскае Палессе і Падняпроўе», т.6
Мінск, «Вышэйшая школа», 2012

**31. Ой, няма, няма**
в. Дуброва, Светлагорскі раён. Запісана ад П.М. Дайнекі.
«Вянок беларускіх народных песень», Мінск, «Навука і тэхніка», 1988

**32. За горою каменою**
в. Чэрніцы і Пагост, Петрыкаўскі раён.



# Змест


*Ай, калядачкі, нашы нежачкі* ........ 3
*Прыйшла Каляда ўвечары* ........ 4
*Добры вечар табе, пане гаспадару* ........ 5
*А ў бару, ў бару* ........ 6
*Святы Мікалай* ........ 8
*По конец стола седзіць Мікола* ........ 9
*Нова радасьць стала* ........ 10
*Неба і Зямля* ........ 12
*А ўчора зь вячора* ........ 15
*Добры вечар, шчодры вечар* ........ 17
*Добры вечар тому* ........ 18
*Ходзіло-блудзіло сэмсот малойцэв* ........ 19
*Шчодры вэчор* ........ 20
*Посярод двора крутая гора* ........ 21
*Ой, што то ў бару* ........ 22
*Ой, рана-рана куры запелі* ........ 23
*Ой, рана, рана* ........ 24
*А ў ляску, ў ляску* ........ 25
*На луцэ, на луцэ, шоўкавай траве* ........ 26
*На вараным канёчку* ........ 27
*Ехала Каліда з Полацку* ........ 28
*Го-го-го, каза* ........ 29
*О-го-го, коза жэ, о-го-го, сера* ........ 31
*Ой, ну-ну, коза* ........ 32
*А ў заінькі* ........ 34
*Будзь, Вася, здароў* ........ 35
*Ой, за лесом, лесом* ........ 36
*Ляцела сойка чэраз наша сёлка* ........ 38
*Ой, стаіць явор* ........ 39
*Да на Дунаечку* ........ 40
*Ой, няма, няма* ........ 41
*За горою каменою* ........ 43
Звесткі пра песні ........ 44

*Выданне для вольнага часу*

# КАЛЯДНЫ СПЕЎНІК

Адказны за выданне *Ігар Віркоўскі*

Укладанне: *Сяржук Доўгушаў*
Расшыфроўка нот: *Аляксандр Ясінскі*
Набор нотнага матэрыялу: *Ганна Канстанцінава*
Падрыхтоўка і набор тэкстаў: *Сяржук Доўгушаў*
Уступны тэкст: *Яніна Грыневіч*
Рэдактар: *Эла Кулеш*
Дызайн, шыхтаванне: *Святлана Клепікава*

*Ноты, якія ўзяты з розных крыніц, у зборніку пададзены ў рэдакцыі, накіраванай на ўніфікацыю матэрыялу і больш лёгкае яго ўспрыманне шырокім колам карыстальнікаў*

*У аздабленні кнігі выкарыстаны матывы традыцыйных падляшскіх і палескіх выцінанак. У аздабленні вокладкі выкарыстаны фотаздымак М. Лешчанкі*

Падпісана да друку 09.12.2020.
Фармат 70×100/32. Папера афсетная. Друк афсетны.
Гарнітура Corbel. Ум. друк. арк. 1,95.
Наклад 2000 ас.
Замова № 3388.

Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Медиал»
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы
і распаўсюдніка друкаваных выданняў № 1/208 ад 07.03.2014
вул. Караля, 9-118, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

Надрукавана ў друкарні «Поликрафт»,
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы і
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 2/14 ад 21. 11. 2013 года.
вул. Кнорына, 50, корп. 4, п. 401а, 220103, г. Мінск,
Рэспубліка Беларусь

ISBN 978-985-7229-39-0

9 789857 229390

TRADYCYJA

